Ф 06-002

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

**Установа адукацыі**
**«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»**
**(ГрДУ імя Янкі Купалы)**

Министерство образования Республики Беларусь

**Учреждение образования**
**«Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»**
**(ГрГУ им. Янки Купалы)**

ЗАГАД

ПРИКАЗ

12.01.2022 № 30

г. Гродна

г. Гродно

Аб правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы

З мэтай развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў і супрацоўнікаў універсітэта, выхавання патрыятызму і ў сувязі з 140-годдзем з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы

**ЗАГАДВАЮ:**

1. Зацвердзіць план мерапрыемстваў, прысвечаных 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы (прыкладаецца).
2. Зацвердзіць аргкамітэт па правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы (прыкладаецца).
3. Дэканам факультэтаў, дырэктарам каледжаў універсітэта пры планаванні працы на 2022 год прадугледзець мерапрыемствы, прысвечаныя 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы.
4. Планава-эканамічнаму аддзелу (І.П. Бябко) прадугледзець расходы на правядзенне мерапрыемстваў.
5. Бухгалтэрыі (В.С. Гацук) забяспечыць фінансаванне расходаў на правядзенне мерапрыемстваў згодна з каштарысам на кожнае мерапрыемства.
6. Цэнтру па сувязях з грамадскасцю (Г.В. Салаўёва) ажыццяўляць інфармацыйнае суправаджэнне мерапрыемстваў.
7. Інфармацыйна-аналітычнаму цэнтру (Я.У. Алізаровіч) аказваць тэхнічную падтрымку пры правядзенні мерапрыемстваў па заяўках ініцыятараў мерапрыемстваў.
8. Агульную каардынацыю дзейнняў па арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў ускласці на дырэктара навуковай бібліятэкі М.У. Грынько.
9. Кантроль аб выкананні загада ўскласці на першага прарэктара Ю.Я. Раманоўскага.

Рэктар універсітэта І.Ф. Кітурка

ГД, з. 1339, т. 6000 экз.

Зацверджана
загадам рэктара
ад 12.01.2022 № 80

Аргкамітэт
па правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных
140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы

1. Раманоўскі Ю.Я., першы прарэктар – *старшыня аргкамітэта*.
2. Грынько М.У., дырэктар навуковай бібліятэкі – *намеснік старшыні аргкамітэта*.
3. Васкевіч В.В., загадчык сектара перыядычных, даведачных выданняў і дысертацыйнага фонду – *сакратар аргкамітэта*.
4. Белакоз А.І., начальнік цэнтра інтэрнацыяналізацыі адукацыі.
5. Ганчар С.В., дэкан філалагічнага факультэта.
6. Глазеў А.А., начальнік навукова-даследчай часткі.
7. Грынько С.Д., старшы выкладчык кафедры прыродазнаўчых і лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання.
8. Калоша Т.А., загадчык музея.
9. Котава А.В., начальнік упраўлення выхаваўчай працы з моладдзю.
10. Садоўская А.С., загадчык кафедры беларускай філалогіі.
11. Салаўёва Г.В., начальнік цэнтра па сувязях з грамадскасцю.
12. Стэльмах А.В., начальнік аддзела культурна-масавай і дасугавай дзейнасці.
13. Русілка В.У, сакратар БРСМ (са згоды).
14. Басінская В.М., старшыня студэнцкага каардынацыйнага савета (са згоды).
15. Прохарава К.В., намеснік старшыні прафкама студэнтаў (са згоды).

Зацверджана
загадам рэктара
ад 12.01.2022 № 30

План мерапрыемстваў,
прысвечаных 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы

| № п.п. | Назва мерапрыемства | Арганізатар (факультэт, кафедра, структурнае падраздзяленне, грамадская арганізацыя) | Час правядзення | Мяркуемыя ўдзельнікі | Прыкладная колькасць удзельнікаў | Неабходныя рэсурсы |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | Падпісанне дамовы аб супрацоўніцтве паміж установай адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы” і ўстановай “Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы” | Навуковая бібліятэка | Люты | Рэктар універсітэта, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, супрацоўнікі, студэнты | 20 | Аўдыторыя для падпісання дамовы, падарункі |
| 2. | Газетная рубрыка “Нам засталася спадчына: да 140- | Цэнтр па сувязях з грамадскасцю, навуковая бібліятэка | Штомесячна | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы” ў газеце “Гродзенскі універсітэт” | | | | | |
| 3. | Флэшмоб “Купалава слова гучыць па ўсім свеце” (чытаем вершы Купалы на розных мовах) | Навуковая бібліятэка, цэнтр інтэрнацыяналізацыі адукацыі | Люты | Рэктарат, беларускія і замежныя студэнты | 30 | Падзякі, граматы, сувенірная прадукцыя |
| 4. | Купалаўская дыктоўка, прысвечаная Дню роднай мовы | Кафедра беларускай філалогіі | Люты | Студэнты, выкладчыкі, медыйны кластар, Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт, Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, замежныя партнёры (МДУ імя М.В. Ламаносава, КНР і інш.) | 500 | Бланкі, ручкі |
| 5. | Конкурс дэкламатараў вершаў “Роднае слова” | ПА/РК ГА “БРСМ” | Люты | Студэнты | 20 | Аўдыторны фонд, сувенірная прадукцыя |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6. | Літаратурна-музычная кампазіцыя “Чытаем Купалу разам” (да Міжнароднага дня паэзіі) | Кафедра беларускай філалогіі | 21 сакавіка | Дэканы факультэтаў, рэктарат, беларускія і замежныя студэнты | 150 | Актавая зала, тэхнічнае абсталяванне |
| 7. | UniQuiz: па слядах Янкі Купалы | УВРзМ, прафкам студэнтаў | Сакавік | Студэнты і супрацоўнікі | 100 | Сувенірная прадукцыя, дыпломы камандам-удзельнікам. |
| 8. | Квэст-гульня “Купалаў след у Alma-mater” | Навуковая бібліятэка, прафкам студэнтаў | Сакавік | Студэнты і супрацоўнікі | 100 | Сувенірная прадукцыя |
| 9. | Фотаконкурс “Родная старонка” | ПА/РК ГА “БРСМ” | Сакавік | Студэнты, маладыя спецыялісты | 50 | Праца ў сацыяльных сетках, падарункі |
| 10. | Літаратурна-музычная праграма “І не змоўкнуць ніколі Купалавы словы” | УВРзМ | Красавік | Удзельнікі творчых калектываў ўніверсітэта, студэнты і супрацоўнікі | 500 | Прэзентацыя; відэаролік на тэму канцэрта; запрашэнне дзіцячага фальклорна-танцавальнага калектыву; асабісты ўдзел супрацоўнікаў |
| 11. | Творчая пляцоўка “Я адкрываю Купалу…” | Кафедра прыродазнаўчых і | Красавік | Студэнты і выкладчыкі | 40 | Падзякі, сувенірная |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | (выстава творчых прац) | лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання | | педагагічнага факультэта | | прадукцыя |
| 12. | Спартыўна-мастацкі фестываль “Купалаўскі старт” | Прафкам студэнтаў, ПА/РК ГА “БРСМ”, КСС | Красавік | Студэнты | 100 | Сувенірная прадукцыя |
| 13. | Конкурс літаратурных эсэ студэнтаў Купалаўскага ўніверсітэта “Мой Янка Купала” | Кафедра беларускай філалогіі, ПА/РК ГА “БРСМ” | Май | Студэнты | 30 | Дыпломы, сувенірная прадукцыя |
| 14. | Плэнер студэнтаў факультэта мастацтваў і дызайну ў Вязынцы | Факультэт мастацтваў і дызайну | Май | Студэнты | 30 | Экскурсійныя выдаткі |
| 15. | Чэлендж “Канікулы з кнігай Купалы” | Навуковая бібліятэка | Чэрвень – жнівень | Студэнты і супрацоўнікі | 70 | Праца ў сацыяльных сетках |
| 16. | Тэматычны дзень творчасці “Купальскі вянок” у межах турзлёту супрацоўнікаў універсітэта “Купалле з Купалам” | Рэктарат, прафкам супрацоўнікаў, УВРзС | Чэрвень | Супрацоўнікі | 250 | Дыпломы, сувенірная прадукцыя |
| 17. | “Пад светлым іменем Купалы” – летняя школа беларускай | Навуковая бібліятэка, цэнтр | Ліпень | Замежныя студэнты | 30 | Канцтавары, экскурсійныя выдаткі |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | мовы і культуры для замежных студэнтаў | інтэрнацыяналізацыі адукацыі | | | | |
| 18. | Квіз “На Купалле, на святое…” | ПА/РК ГА “БРСМ” | Ліпень | Студэнты, байцы будаўнічых атрадаў | 70 | Праца ў сацыяльных сетках |
| 19. | Літаратурная гасцёўня “У гасцях у Купалы” ў рамках праекта “Жывая гісторыя” | УВРзМ | Ліпень | Студэнты і супрацоўнікі | 70 | Сувенірная прадукцыя |
| 20. | Выстава творчых прац студэнтаў факультэта мастацтваў і дызайну ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы | Факультэт мастацтваў і дызайну | Жнівень | Студэнты і супрацоўнікі | | Падзякі, сувенірная прадукцыя |
| 21. | Прэзентацыя творчых калектываў на прыкладзе літаратурна-музычнай праграмы “І не змоўкнуць ніколі Купалавы словы” для першакурснікаў | УВРзМ | Верасень | Студэнты і супрацоўнікі | 500 | Прэзентацыя; відэаролік на тэму канцэрта; запрашэнне дзіцячага фальклорна-танцавальнага калектыву; асабісты ўдзел супрацоўнікаў |
| 22. | Акцыя “Купалаўская паштоўка”: да Дня беларускага пісьменства | Навуковая бібліятэка | Верасень | Студэнты і супрацоўнікі | 30 | Матэрыялы для вырабу паштоўкі, |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 23. | Анлайн-віктарына “Таямніцы класікаў” | Навуковая бібліятэка | Верасень – кастрычнік | Студэнты і супрацоўнікі | 50 | Падзякі, граматы, сувенірная прадукцыя |
| 24. | Конкурс буктрэйлераў “Спадчына” | ПА/РК ГА “БРСМ” | Верасень – кастрычнік | Студэнты | 100 | Праца ў сацыяльных сетках, дыпломы, сувенірная прадукцыя |
| 25. | Выстава творчых прац студэнтаў факультэта мастацтваў і дызайну | Факультэт мастацтваў і дызайну | Кастрычнік | Студэнты факультэта мастацтваў і дызайну | 30 | Падзякі, граматы, сувенірная прадукцыя |
| 26. | “Сын і пясняр народа”: сумесная выстава Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і музея гісторыі развіцця ўніверсітэта | Музей гісторыі развіцця ГрДУ імя Янкі Купалы | Кастрычнік | Супрацоўнікі і студэнты ўніверсітэта, супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы | 500 | Выставачная пляцоўка, абсталяванне для выставы, сувенірная прадукцыя |
| 27. | Акцыя “Купала і Колас, вы нас гадавалі” (да юбілею Якуба Коласа) | Навуковая бібліятэка | Лістапад | Студэнты і супрацоўнікі | 30 | Падзякі, сувенірная прадукцыя |
| 28. | Фотачэлендж “#Што_Сэрцу_Міла” | ПА/РК ГА “БРСМ” | Лістапад | Студэнты | 20 | Праца ў сацыяльных сетках |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 29. | KUPALA-квэст | Прафкам студэнтаў, ПА/РК ГА “БРСМ” | Снежань | Студэнты, маладыя спецыялісты | 50 | Аўдыторны фонд, падарункі |
| 30. | Экскурсія студэнтаў – пераможцаў конкурсаў, віктарын, прысвечаных юбілею Янкі Купалы ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы | Навуковая бібліятэка | Снежань | Студэнты, выкладчыкі | 50 | Экскурсійныя выдаткі |